ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
26
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 20 (1396)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

У ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

факультэтаў і падраздзяленняў праходзяць справаздачна-выбарныя сходы. На іх камуністы падводзяць вынікі сваёй дзейнасці за прайшоўшы вучэбны год.

М. МІХЕЙЧЫК.

80-ГОДДЗЮ

ІІ з'езда РСДРП была прысвечана канферэнцыя, што прайшла на гістарычным факультэце. Адкрыла яе дэкан прафесар І. В. Царук.

З дакладамі выступілі член КПСС з 1926 года, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М. Я. Аўхімовіч, дацэнты кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў І. Ф. Раманоўскі, Ф. І. Мельнік, В. М. Клімовіч.

Ф. МЕЛЬНІК,
дацэнт кафедры гісторыі КПСС гумакітарных факультэтаў.

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

прайшла на факультэце журналістыкі. Яна прысвячалася 165-годдзю з дня нараджэння К. Маркса. З цікавымі дакладамі выступілі ўдзельнікі навуковага гуртка гісторыі журналістыкі Л. Філімонава, І. Цалуйка, С. Навумчык, А. Мозалева.

Л. САКАЛОВА,
староста навуковага гуртка гісторыі журналістыкі, студэнтка журфака.

У ДАПАМОГУ ПІЯНЕРВАЖАТАМУ

аддзелам масавай работы бібліятэкі універсітэта арганізавана выстаўка. На ёй шырока прадстаўлены кнігі вядомых педагогаў Н. К. Крупскай, А. С. Макаранкі, В. А. Сухамлінскага, дакументы партыі і камсамола, што датычаць піянерскага руху, кнігі па выхаванню дзяцей, педагогіцы, гісторыі піянерскай арганізацыі, мемуарная літаратура — расказы першага пакалення піянераў і важатых, літаратура аб турызме і спорце, сцэнарыі мерапрыемстваў, мастацкая літаратура, метадычныя рэкамендацыі і бібліяграфічныя матэрыялы.

А. КІШКЕВІЧ,
супрацоўніца аддзела масавай работы бібліятэкі.

ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

СТАЖЫРОЎКА МАЛАДЫХ ЛЕКТАРАЎ

З МЭТАЙ НАБЫЦЦЯ практычных навыкаў у прапагандзе грамадска-палітычных і навукова-тэхнічных ведаў слухачамі факультэта грамадскіх прафесій ва універсітэце прайшоў тыдзень маладога лектара. Больш за 60 пачынаючых прапагандыстаў выступілі з лекцыямі і гутаркамі ў студэнцкіх аўдыторыях, падшэфных школах і прафесійна-тэхнічных вучылішчах, на прамысловых прадпрыемствах горада. Актуальныя задачы камуністычнага выхавання моладзі разгледзеў у сваёй лекцыі перад камсамольцамі сярэдняй школы № 50 Мінска студэнт мехмата Д. Малінін. З цікавасцю слухалі расказ аб флагмане вышэйшай школы рэспублікі — Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна — маладыя рабочыя ДПЗ-11, дзе выступіў студэнт мехмата М. Дубовік. Зараз першаступеннай задачай чалавецтва з'яўляецца барацьба за мір. Гэта ідэя была галоўнай у выступленні студэнта фізфака П. Дырды «Народы планеты ў барацьбе за мір».

Закончыўся тыдзень маладога лектара правядзеннем IV агульнаўніверсітэцкай навукова-практычнай канферэнцыі слухачоў школы маладога лектара, арганізаванай дэканатам ФГП, камітэтам камсамола і арганізацыяй таварыства «Веды». Уступным словам канферэнцыю адкрыў прарэктар універсітэта У. С. Багданаў. Ён адзначыў вялікую ролю ФГП, кафедр грамадскіх навук у падрыхтоўцы маладых лектараў, адзначыў, што ва ўмовах масавага наступлення імперыялістычнай прапаганды на заваёвы сацыялізму сваё слова павінны сказаць і маладыя прапагандысты.

У дакладах удзельнікаў IV канферэнцыі была разгледжана гістарычная роля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, ленінскай нацыянальнай палітыкі, камсамола ў ажыццяўленні аграрнай палітыкі КПСС у перыяд развітога сацыялізму. Са змястоўным дакладам выступіў студэнт радыёфізічнага факультэта Ю. Лавец «Савецкая Беларусь у брацкай сям'і народаў СССР». Вялікую цікавасць выклікаў у слухачоў і даклад В. Шадурскага «Ідэалагічная барацьба і моладзь».

Набытыя веды і навыкі лекцыйнай работы стануць добрай падмогай маладым лектарам у іх далейшай прапагандысцкай рабоце.

І. ПІРОЖНІК,
дэкан факультэта грамадскіх прафесій.

НА ЗДЫМКУ: шмат гадоў кіруе работай секцыі «Гісторыя ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху» школы маладога лектара дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Міхаіл Георгіевіч Жаркоў, якога вы бачыце ў першым радзе сярод удзельнікаў IV навукова-практычнай канферэнцыі маладых лектараў.

Фота **А. Няхаевай,**
слухачкі гуртка фотакарэспандэнтаў ФГП.

ПОШУК ВУЧОНЫХ

Публіцыстыка ў барацьбе за мір

УЖО НЕ ПЕРШЫ год працуе намеснікам дэкана факультэта журналістыкі Іван Іванавіч Сачанка. Ён не толькі кіруе грамадска-палітычнай і вучэбнай дзейнасцю студэнтаў, натхняе будучых майстроў пяра, але і шмат часу прысвячае навуцы. Доктарская дысертацыя, якую ён абараніў нядаўна, атрымала высокую ацэнку.

— Катаванні і жахі вайны, перажытыя ў дзяцінстве, калі я знаходзіўся на тэрыторыі Германіі,— расказвае І. І. Сачанка,— ніколі не згаснуць у памяці. Гэтыя ўспаміны не камянеюць з кожным годам, а наадварот — усё часцей абпальваюць полымем болю аб трагічным лёсе народаў Еўропы, што сталі ахвярамі гітлерызму. Таму такую важнасць мела для мяне дысертацыя на тэму «Публіцыстыка ў барацьбе супраць фашызму і адраджэння неанацызму».

Яна стваралася аўтарам на працягу дванаццаці гадоў. За гэты тэрмін быў вывучаны рознабаковы матэрыял, пачынаючы ад дакументаў ваеннага часу—няўмольных сведчанняў звярстваў нацыстаў — да сённяшніх дзён, калі праз радкі буржуазнага друку зноў праглядвае самазадаволены твар фашысцкай пачвары. Былі выкарыстаны шматлікія даследаванні савецкіх гісторыкаў, выданні калег краін сацыялізму, газеты, часопісы, абагульнены вопыт сучаснай публіцыстыкі ў барацьбе за захаванне міру. Акрамя таго, І. І. Сачанка выступіў з шэрагам работ на старонках друку.

Зацікавіўся дысертацыяй тройчы Герой Савецкага Саюза Іван Мікалаевіч Кажадуб, які ў сваім водгуку на аўтарэферат высока ацаніў значэнне публіцыстычнага слова ў барацьбе за мір, супраць фашызму і адраджэння неанацызму.

— Гэта не выпадкова, — гаворыць І. І. Сачанка, — бо зараз у адной толькі Заходняй Германіі разгортвае дзейнасць больш за 150 нацысцкіх груповак. 70 выдавецтваў распаўсюджваюць прафашысцкую літаратуру, імкнуцца абяліць злачынцаў, ухваляючы фюрэра, і адкрыта пагражаюць сілам міру і прагрэсу. Так, напрыклад, зусім нядаўна былі перавыдадзены творы Гебельса, часопіс «Сігнал» з яго прамовамі і нават некалькі гадоў назад паявілася кніга (не адзіная ў сваім родзе) пад назвай... «Гітлер — вялікі мастак XX стагоддзя».

Жывуць і імкнуцца ажыццявіць свае планы былыя нацысцкія главары. Пакуль чакае справядлівага суда ліёнскі карнік Клаус Барб'е, на свабодзе разгульваюць тысячы іншых. Прывольна адчуваюць яны сябе ў Афрыцы пад апекай рэжымаў апартэіду, найлепшую глебу для сваіх жудасных планаў знаходзяць у некаторых краінах Лацінскай Амерыкі. Але ўзнімаюцца на барацьбу народы. Ужо не існуе на зямлі крывавай дыктатуры Самосы, з кожным днём расце вызваленчы рух у Сальвадоры і Гватэмале, змагаюцца за светлае будучае чылійскія патрыёты. І разам з вінтоўкай найвялікшая роля належыць пяру, бо назаўжды трэба перамагчы ідэалагічных забойцаў, — упэўнены І. І. Сачанка.

Э. ОЛІНА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

АДПАВЯДАЦЬ НАДЗЁННЫМ ПАТРАБАВАННЯМ

ПРАЙШОЎ АГЛЯД-КОНКУРС насценнага друку «пражэктарыстаў» універсітэта, прысвечаны Дню друку. Нялёгка было вызначыць лепшыя нумары. Але ўсё ж камісія аддала перавагу юрфаку. Выпускі «КП» факультэта прыгожа і арыгінальна аформлены, матэрыялы палемічныя, з вострай крытыкай.

У факультэцкіх нумарах «КП» шмат агульных тэм: вучэбная дысцыпліна, інтэрнацкае жыццё, грамадская работа і г. д. Але ў кожнага — свой «твар».

— Імкнемся не абмяжоўвацца пералічэннем недахопаў, якія паказалі рэйды-праверкі, — расказвае старшыня штаба «КП» гістфака Аляксандр Каханоўскі. — Ёсць у нашых выступленнях прапановы студсаветам, камітэту камсамола. Выкананне іх бяром пад кантроль.

«Пражэктарысты» мехмата не даюць спакою парушальнікам вучэбнай дысцыпліны, «хвасцістам», фізікаў хвалююць пытанні павышэння актыўнасці студэнтаў, удасканалення форм сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі. Яны прапануюць арганізаваць спаборніцтва на лепшую групу факультэта, праводзіць папярэднюю атэстацыю ў групах, завесці на кожнага студэнта карткі актыўнасці, дзе адзначаць выкананне грамадскіх даручэнняў і г. д.

Камісія адзначыла шэраг недахопаў у выпуску нумароў «КП». Важнасць праблем, вастрыня і арыгінальнасць выступленняў былі галоўнымі крытэрыямі ацэнкі конкурсных нумароў.

І. ЗЫБАЙЛА,
член штаба «КП» універсітэта.

Спыніцца, азірнуцца...

СУСТРЭЧЫ Ў РЭДАКЦЫІ

Дыплом і асоба. Малады спецыяліст. Які ён? Што далі пяць студэнцкіх гадоў? З кожным новым выпускам узнікаюць пытанні, вырашыць якія няпроста. На многія з іх адказа час, гэты своеасаблівы і бескампрамісны АТК, таму сённяшняя размова з пяцікурснікамі не прэтэндуе на вырашэнне ўсіх праблем. Яна толькі акрэсліць іх кола і тым самым у некаторай ступені дапаможа ўбачыць іх — выпускнікоў 83-га.

У размове прымаюць удзел: выпускнікі Галіна Грэчка, Рыгор Пшанічны (хімічны факультэт), Юрый Варатніцкі (факультэт радыёфізікі і электронікі), Аляксандр Лазоўскі (факультэт журналістыкі), Аляксандра Рыжая, Людміла Хінто (біялагічны факультэт), намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце Ала Нежавец, карэспандэнт газеты Наталля Калішэвіч.

КАРЭСПАНДЭНТ: — Калі б давялося выбіраць зноў, паступалі б вы на той жа факультэт, ці змянілі б спецыяльнасць?

Г. ГРЭЧКА: — Я на хімфак двойчы паступала. Не шкадую.

Ю. ВАРАТНІЦКІ: — У другім «амплуа» сябе ўяўляю з цяжкасцю.

Г. ПШАНІЧНЫ: — Бацькі ў мяне хімікі, гэта ўжо як дынастыя нейкая...

А. РЫЖАЯ: Біяфак для мяне —гэта... Ну, не ведаю, гэта біяфак, і ўсё тут. Але прафесія— не толькі выбар, а і шлях да яе. І калі ўжо загаварылі пра падарожжа ў мінулае, дык вось аб чым шкадую: позна ў СНТ прыйшла. Столькі часу змарнавала! Удзельнічаць у навукова-даследчай рабоце трэба з курса другога, а то і з першага. Няхай спачатку не вельмі творчую справу даручаць, галоўнае —навык, ды і нейкія арганізацыйныя здольнасці праявяцца...

Г. ГРЭЧКА:—Не ведаю. Мне здаецца, ад СНТ ніякай асаблівай карысці няма. Ну, рабіла нешта па заданню. Які ў гэтым сэнс? Толькі дзесьці на 4-м курсе далучылася да сапраўднай навуковай работы. Затое ўжо ведала, куды накіраваны мае намаганні, і ў вучобе гэта дапамагала. Думаю, не трэба спяшацца. Усё ў свой час прыйдзе.

Ю. ВАРАТНІЦКІ: — А я згодзен з Сашай. Неабходна нейкі час «паварыцца» ў атмасферы навуковай дзейнасці. Потым лягчэй прыступіць да яе самой.

КАРЭСПАНДЭНТ: — Нешта **пакуль не зусім зразумела, што «ветэраны» раяць: пачынаць ці пачакаць!**

А. НЕЖАВЕЦ: — Адразу і станоўчы, і адмоўны адказ можна даць. Напрошваецца аналогія з грамадскай работай: калі наваліць на першакурсніка шмат даручэнняў, ён так спалохацца можа, што потым яго днём з агнём не адшукаеш. А нейкія пасільныя заданні, наадварот, заахвоцяць. Галоўнае —пачуццё меры.

Ю. ВАРАТНІЦКІ: — Аналогія дакладная, толькі ты не да канца яе правяла. Справа ў тым, што, на мой погляд, студэнт як асоба раскрываецца ў дзвюх формах дзейнасці—грамадскай і прафесійнай. Студэнцкая навукова-даследчая работа дазваляе максімальна праявіць сябе і ў той, і ў другой.

Л. ХІНТО: — Не толькі праявіць тое, што маеш, але і выхаваць нейкія неабходныя якасці: настойлівасць, працавітасць, абавязковасць і іншыя.

КАРЭСПАНДЭНТ: — Якасці прафесіянала!

Р. ПШАНІЧНЫ: — Калі хочаце, так. Прафесіянала і арганізатара.

А. РЫЖАЯ: — Вось з апошнім якраз і не згодна. Які з мяне арганізатар? Здаецца, камсоргам групы была, ад агульных спраў ніколі не ўхілялася, але вось адчуваю — не здолею. Агульная наша памылка ў тым, што мы часта блытаем арганізацыйныя якасці ў грамадскай рабоце з імі ж, але ў прафесійнай дзейнасці. Гэта розныя рэчы. Напрыклад, я еду па размеркаванню ў Гродна. Буду настаўніцай. Скажу прама, такая перспектыва мяне не захапляе. Неяк увесь час арыентавалася на навуковую работу.

КАРЭСПАНДЭНТ: — Можа, справа ў тым, што ты дрэнна ведаеш сваю будучую прафесію! Сама прызнаешся — не вельмі імкнулася да яе. Дарэчы, педагагічная практыка ў вас была!

А. РЫЖАЯ: — Была. Месяц.

КАРЭСПАНДЭНТ: — І хапіла, каб разабрацца, што работа не па душы!

А. РЫЖАЯ: — Хапіла.

А. ЛАЗОЎСКІ: — А мне здаецца, што прафесійна «падкаваны» чалавек проста не зможа не праявіць сябе. Ты згодна, што як спецыяліст падрыхтавана добра, значыць, рана ці позна паявіцца жаданне паказаць, на што ты здольна, а гэта першы крок да любві к прафесіі.

Р. ПШАНІЧНЫ: — Так, усё высветліць справа.

КАРЭСПАНДЭНТ: — Мы размаўляем аб прафесійных якасцях маладога спецыяліста і неяк забыліся пра маральныя, а яны ж узаемазвязаны...

А. НЕЖАВЕЦ: — І яшчэ як. Непарыўна. Магчыма, вас гэта здзівіць, але хачу гутарку пра маральныя якасці будучага спецыяліста пачаць з... адпачынку. Неяк усё больш пераконваюся ў тым, што нідзе так, як у вольны час, не бачны чалавек. Колькі прыкладаў вядома: і вучыцца студэнт няблага, і па грамадскай рабоце ў перадавых, а ў інтэрнаце — першы п'яніца. Чаму? Самы лёгкі выхад: «адпачынак», які не патрабуе ніякіх маральных затрат. Ці будзе такі спецыяліст аўтарытэтам? Ён аб гэтым часцей за ўсё не думае, проста не звязвае адно з другім. А шкада...

Г. ГРЭЧКА: — І не толькі ў гэтым справа. Ты, Ала, экстрэмальны прыклад узяла. А вось зусім звычайны, але не менш сур'ёзны. Прыязджае першакурснік з вёскі ў Мінск. Здавалася б, шукай час, каб тэатры і музеі наведваць, да культуры далучацца. Куды там, ляжаць сабе ў інтэрнатах на ложках, добра яшчэ, калі з кнігай у руках.

А. НЕЖАВЕЦ: — Гэта праблема, у якой і мы, старэйшыя, вінаваты. Не вучым, не тлумачым, не паказваем. Добра, калі б у канаерт разам з выклікам мы маглі б пакласці своеасаблівую метадычку з расказам пра горад, яго гісторыю. Нават карту-схему Мінска з абазначэннем музеяў і тэатраў можна было б дадаць, кароткія анатацыі на найбольш цікавыя спектаклі напісаць. Гэта не проста мая фантазія. У Ташкенце такое ўжо практыкуецца. І з поспехам.

А. ЛАЗОЎСКІ:—І паявілася б яшчэ адна добрая традыцыя.

КАРЭСПАНДЭНТ: — Дарэчы, аб студэнцкіх традыцыях. Ці не здаецца вам, што іх стала менш!

УСЕ РАЗАМ: — Так, некаторыя зусім зніклі.

— Медыум той жа.

— Ды што там медыум, звычайны студэнцкі вечар у што ператварыўся! Вульгарныя танцулькі!

Л. ХІНТО: — Ад нашых скаргаў нічога не зменіцца. Справа ў іншым: студэнт павінен памятаць, што ён студэнт. Як мы ганарымся, напрыклад, будатрадаўскімі курткамі — своеасаблівым знакам далучэння да студэнцкага братэрства?! Але гэта летам. А з паўсядзённага жыцця такая, абавязковая раней, студэнцкая сімволіка некуды знікла. Як добра было б нешта аднавіць.

Ю. ВАРАТНІЦКІ: — Нейкі дух студэнцтва...

Р. ПШАНІЧНЫ: — Хацелася, каб яго адчулі тыя, хто паступіць у гэтым годзе. Пасвячэнне ў студэнты павінна заўсёды заставацца сапраўдным і непаўторным святам.

А. ЛАЗОЎСКІ: — А для нас няхай у лепшых традыцыях пройдзе выпускны баль.

КАРЭСПАНДЭНТ: — З задавальненнем далучаюся да гэтага пажадання.

...Рамова на гэтым не скончылася. Абмяркоўваліся магчымыя варыянты выпускнога вечара, нехта гаварыў пра ўклад у навуку. Гутаркі, спрэчкі, праблемы... А мне раптам дакладна ўявілася, як гадоў праз дзесяць Юра Варатніцкі будзе накручваць дыск тэлефона і ўсхвалявана крычаць у трубку: «Дык што, збіраемся! Усім курсам!», Саша Рыжая, паважаная настаўніца, — хочацца верыць, што яна яшчэ палюбіць сваю прафесію — пабяжыць на пошту адбіваць тэлеграму: «На сустрэчу з аднакурснікамі прыязджаю», а Аляксандр Лазоўскі, к таму часу вядомы журналіст, надрукуе ў раённай газеце ўспаміны—«Студэнты 80-х». Хочацца верыць, што ўсё будзе добра. І пажадаць ім гэтага — сумленнага, адкрытага, шчаслівага шляху ў сталае жыццё.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

ПОМНІК ПЕСНЯРУ

НА ПАЛІЦАХ адна за другой акуратна раскладзены кнігі. На вокладках партрэты людзей, якія ўжо прыходзілася бачыць у падручніках па гісторыі, фізіцы, матэматыцы, у часопісах і газетах, у зборніках вершаў і прозы. Аляксандр Суворaў, Жуль Верн, Максім Горкі... І раптам сярод мноства падобных па знешняму афармленню кніг позірк сутыкаецца з жывым позіркам маладога чалавека. Гэтыя ўдумлівыя вочы, бяздонная глыбіня, невыказная зачараванасць. Побач з партрэтам назвы зборнікаў: «Жалейка», «Спадчына», «Маладняк». І ў самым нізе вокладкі белая стужка — «Жыццё выдатных людзей».

Зусім нядаўна ў гэтай серыі выйшла першая кніжка пра дзеяча беларускай нацыянальнай літаратуры і культуры — Янку Купалу. Аўтар яе—літаратуразнаўца і крытык, доктар філалагічных навук, прафесар нашага універсітэта Алег Антонавіч Лойка. Абмеркаванню кнігі была прысвечана канферэнцыя чытачоў, якая адбылася на філалагічным факультэце.

Выданне кнігі «Янка Купала» супала з дзвюма значнымі падзеямі: 60-годдзем утварэння СССР і 50-годдзем з пачатку выдання кніг серыі «ЖВЛ». У серыі «Жыццё выдатных людзей» выйшлі 1 мільярд 300 мільёнаў экземпляраў. А ў канцы мінулага года была адкрыта беларуская старонка. Дырэктар выдавецтва «Маладая гвардыя» І. І. Дзесяцерык высока ацаніў працу А. А. Лойкі, які ў мастацка-дакументальнай форме паказаў жыццё і творчасць вялікага песняра Беларусі.

«Гэта, безумоўна, удача! Кніга напісана гарачым сэрцам чалавека, улюбёнага ў творчасць Купалы, высокай эрудыцыі, удумлівага даследчыка — літаратуразнаўцы і гісторыка... Мне здаецца, кніга таму і ўдалася, што пісаў яе добры паэт, сур'ёзны вучоны, які пранік у тайны купалаўскай паэзіі, які сумеў па вершах, па іх настрою, часу і месцу напісання ўзнавіць з дакладнасцю, якая не выклікае сумненняў, многія факты біяграфіі Купалы, яго ўзаемаадносіны са сваімі сучаснікамі». Так напісаў у сваёй прадмове да кнігі А. А. Лойкі народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы І. П. Шамякін.

Янка Купала. Гэта імя нам знаёма з маленства. Здаецца, мы ведаем асноўныя вехі жыцця вялікага песняра, не раз чыталі пра яго, былі ў музеі, з хваляваннем блукалі па сцежках Вязынкі. Але дастаткова прачытаць некалькі старонак новай кнігі А. А. Лойкі, каб здзівіцца мізернасці сваіх ведаў пра Купалу і ўразіцца, захапіцца ім.

Перад намі праходзіць жыццё чалавека. Складаная дарога з рэзкасцю перападаў і сонечнасцю ўзлётаў. Жыццё такое ж неспакойнае, як і час, у які выпала жыць. Са старонак кнігі паўстае перад намі паэт, грамадзянін, чалавек, які заўсёды ў цэнтры падзей. Вось гэту незаспакоенасць, вечнае гарэнне свайго героя А. А. Лойка ўмела раскрывае з дапамогай мастацка-дкументальных сродкаў. «Важнейшая якасць кнігі — яе гістарычная дакладнасць не толькі там, дзе яна пацверджана дакументамі, але і ў тых выпадках, дзе дакументаў няма, не было іх ці яны страчаны, і аўтару сваёй фантазіяй, даследчай інтуіцыяй, веданнем эпохі трэба было напоўніць гэтыя «белыя плямы». (З прадмовы І. П. Шамякіна).

Шмат цёплых слоў прагучала на канферэнцыі ў адрас аўтара. Выступалі калегі Алега Антонавіча, людзі розных прафесій: работнікі бібліятэкі, супрацоўнікі выдавецтва «Маладая гвардыя», рэдакцыі часопіса «Маладосць», студэнты гістарычнага, фізічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў. Кожны гаварыў пра тое, што асабіста яму дала новая кніга.

А. А. Лойка зрабіў важкі ўклад у святую справу захавання гістарычнай праўды жыцця вялікага паэта. «Кчіга А. Лойкі пра Янку Купалу выйшла ў год 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі — вялікага свята беларускай нацыянальнай культуры, якое па рашэнню ЮНЕСКА адзначалася ва ўсім свеце. Мяркую, што гэта будзе яшчэ адзін дастойны помнік Вялікаму Песняру, роўны таму, які стаіць у Мінску, у Купалаўскім скверы, работы А. Анікейчыка. З той толькі розніцай, што той — у бронзе, а гэты — у жывым усхваляваным слове...» (З прадмовы І. П. Шамякіна).

А. ГРЫШКЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

СВЯТА НА ФІЛФАКУ

СТУДЭНТЫ І ВЫКЛАДЧЫКІ нашага факультэта з хваляваннем рыхтаваліся да вечара ў гонар стогадовага юбілею Янкі Маўра: была выпушчана спецыяльная насценгазета, афармлена з дапамогай бібліятэкі кніжная выстаўка, вітрына. На сценах — прыгожа напісаныя плакаты са словамі Маўра і пра Маўра. Вечар атрымаўся цікавым і незабыўным. Безумоўна, шмат у чым мы абавязаны шчасліваму выпадку сустрэцца з роднымі Янкі Маўра — старэйшым сынам пісьменніка Героем Сацыялістычнай Працы, лаўрэатам Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, акадэмікам АН БССР Фёдарам Іванавічам Фёдаравым, дочкамі — педагогам Аляксандрай Іванаўнай Капыловай і Наталляй Іванаўнай Міцкевіч, агульнымі ўнукамі Янкі Маўра і Якуба Коласа — М. М. Міцкевіч, К. М. Міцкевічам, С. М. Міцкевічам, а таксама з вядомым беларускім паэтам, заслужаным дзеячам культуры БССР С. П. Шушкевічам.

Сустрэчу адкрыў дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк. Праграма яе была арыгінальнай: дакладчыца М. Б. Яфімава адмовілася ад традыцыйнай формы даклада. Выхад у творчасць пісьменніка, слова пра яго як чалавека і мастака спалучаліся з чытаннем урыўкаў з твораў Янкі Маўра і пра яго. Арганічна ўлілася ў кампазіцыю пра пісьменніка класічная музыка.

У канцы сустрэчы прагучала любімая песня Янкі Маўра «Я люблю тебя, жизнь».

Усе прысутныя былі ўсхваляваны гэтай сустрэчай. Неяк па-новаму адкрыўся нам любімы з дзяцінства пісьменнік. Ішла з сустрэчы і, здаецца, чула голас самога Янкі Маўра. Здалося, што і ён быў на нашым свяце.

А. ШАМЯКІНА,
студэнтка філалагічнага факультэта.

Яго героі вучаць нас

ЗНОЎ З ВЯЛІКАЙ колькасці кніг, што стаяць на паліцы, бяру кнігу з прывабнай назвай «Вакол свету», з такім знаёмым прозвішчам аўтара — Янка Маўр.

Не раз перачытвала творы пісьменніка, але заўсёды як бы нанава адкрывала іх для сябе. Дык у чым жа прыцягальная сіла твораў гэтага мастака? Чаму да іх звяртаешся зноў і зноў? Якім жа сакрэтам валодае пісьменнік?

Сапраўды, мастацкае слова Янкі Маўра здольна рабіць цуды. Разгортваеш кнігу, пачынаеш чытаць, і звычайнае слова ператвараецца ў вобразы, малюнкі. Героі твораў Янкі Маўра становяцца зрокава выразнымі, іх нібы бачыш, яны, здаецца, побач... Здаецца, пераносішся ў той час, туды, дзе жывуць героі Маўра, разам з імі змагаешся за перамогу дабра супраць зла, несправядлівасці.

Кожны з нас носіць у сэрцы ўспамін пра невялічкае апавяданне Янкі Маўра «Слёзы Тубі», якое даўно стала хрэстаматыйным. Тады, у дзяцінстве, мы ўпершыню даведаліся, які вялікі свет, даведаліся пра каланіяльны прыгнёт, пра лёс сваіх аднагодкаў у капіталістычных краінах.

Разам з «Палескімі рабінзонамі» мы адкрывалі для сябе роднае Палессе, у герояў «ТВТ» вучыліся ўсё рабіць самі, вучыліся калектывізму, грамадзянскаму неспакою.

Янка Маўр акрыляў фантазію, клікаў у нязведаныя далі.

Л. СМЯЯН,
студэнтка філалагічнага факультэта.

АБАВЯЗАНЫ БАЦЬКУ

МОЙ БАЦЬКА, нягледзячы на тое, што не меў вышэйшай адукацыі, быў чалавекам шырокай эрудыцыі. Сваімі ведамі ён абавязаны кнігам, любоў да якіх выхаваў і ў сваіх дзяцей.

Цяжка назваць такую галіну інтэлектуальнай дзейнасці, якая б не цікавіла бацьку. У нашай кватэры была добрая бібліятэка, якую бацька збіраў з вялікай стараннасцю і любоўю. Атмасфера павагі і любві да кніг і часопісаў была характэрна для нашай сям'і.

Бацька быў аптымістам і жыццялюбам. Любіў дасціпны жарт, адчуваў незвычайную асалоду ад удалага гумару, каламбура, які яму даводзілася чуць. Сам ён таксама валодаў пачуццём гумару, быў лёгкі на выдумку.

Хаця маё прызванне — тэарэтычная фізіка, што вельмі далёка ад гісторыі і геаграфіі, якія захаплялі майго бацьку, аднак я маю ўсе падставы сцвярджаць, што ў маім станаўленні як чалавека і вучонага рашаючую ролю адыграла ўздзеянне бацькі, Івана Міхайлавіча Фёдарава.

Ф. ФЁДАРАЎ,
лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, Герой Сацыялістычнай працы, акадэмік АН БССР.

ДОБРАЗЫЧЛІВЫ ЧАЛАВЕК

АДНА З РЫСАЎ, якую мы асабліва цанілі ў сваім бацьку,—гэта душэўная прастата. Ён заўсёды з павагай ставіўся да людзей, вабіў іх сваёй адкрытасцю, гатовы быў у любы момант прыйсці на дапамогу. Вельмі моцна любіў Янка Маўр дзяцей. Ён разумеў іх, а яны разумелі і любілі яго.

Аднойчы на Чорным моры бацька выратаваў пяцігадовую дзяўчынку. Крык яе чулі ўсе, хто быў на пляжы, але знак бяды ў гэтым крыку першым адчуў бацька. Ён, тады сляпы сямідзесяцігадовы чалавек, кінуўся ў мора, нырнуў і, пакуль людзі апамяталіся, вынес на бераг выратаваную ім дзяўчынку.

Добразычлівы па натуры, бацька быў непрымірымы да фальшу, крывадушша, да прыстасаванцаў, несумленных людзей. Для іх знаходзіў ён і вострае слоўца і здзеклівую рэпліку.

Ніколі не чулі мы ад свайго бацькі нараканняў на дрэнны стан здароўя. У сваіх пісьмах да яго мы заўсёды пыталіся, як ён сябе адчувае, а ён пісаў, што ў гэты момант адчувае сябе на некалькі працэнтаў лепш...

Мы, дзеці, не проста любілі бацьку, але і насілі ў сваіх сэрцах пачуццё глыбокай удзячнасці, павагі да яго. Памятаю, як ён прыходзіў дадому пасля работы, здымаў запацелае пенснэ, і блізарукія яго вочы станавіліся добрымі-добрымі. Твар бацькі са слядамі вайны заўсёды здаваўся мне прыгожым, нават імя — Іван Міхайлавіч— было для мяне самым прыгожым у свеце.

А. КАПЫЛОВА.

Ён — наш сучаснік

ТОЛЬКІ ЧАЛАВЕК з добрым мастацкім густам і багатай фантазіяй мог знайсці для сябе рамантычны і загадкавы псеўданім Янка Маўр. Уладальнік гэтага псеўданіма — выдатны беларускі дзіцячы пісьменнік Іван Міхайлавіч Фёдараў і быў такім чалавекам. Яго адметнасць, знаходлівасць, эмацыянальная чуйнасць, выключнае жыццялюбства выяўляліся ва ўсім: у жыцці, грамадскай і літаратурнай дзейнасці. Творчасць Янкі Маўра вызначаецца сацыяльным зместам, рэвалюцыйным пафасам, гуманізмам, духам наватарства, смелым узлётам фантазіі, услаўленнем чалавека-змагара, творцы. Ён з'яўляецца заснавальнікам беларускай дзіцячай літаратуры, смелым адкрывальнікам новых тэм і жанраў.

Нарадзіўся Янка Маўр 11 мая 1883 года ў г. Лібава (цяпер горад Ліепая Латвійскай ССР), куды яго бацька, беззямельны селянін-беларус, прыехаў у пошуках шчасця. Пасля заканчэння семінарыі Іван Фёдараў настаўнічаў спачатку пад Панявежысам, потым у вёсцы Бытча пад Барысавам. Разам з Якубам Коласам у 1906 годзе прымаў актыўны ўдзел у нелегальным з'ездзе рэвалюцыйна настроеных настаўнікаў. Абодва яны былі звольнены з настаўніцкіх пасад і трапілі пад нагляд паліцыі.

З першых дзён Савецкай улады Іван Міхайлавіч Фёдараў стаў актыўным дзеячам народнай асветы. З 1934 года — член Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі.

У 1950 годзе ва ўзросце 67 гадоў пісьменнік уступіў у Камуністычную партыю Савецкага Саюза — фактычна аформіў сваю партыйнасць, якая заўсёды была яму ўласціва.

Нягледзячы на амаль поўную страту зроку, працаваў над новымі творамі, над перавыданнем раней напісаных кніг, над перакладамі. Ён падтрымліваў сувязь з юнымі чытачамі, выязджаў па творчыя сустрэчы.

За заслугі перад Савецкай дзяржавай і народам Янку Маўру ў 1968 годзе было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР, ён узнагароджаны трыма ордэнамі і медалямі. У 1972 годзе яму, першаму з беларускіх дзіцячых пісьменнікаў, была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР (пасмяротна).

Свой творчы шлях Янка Маўр пачаў у 20-я гады, калі савецкая дзіцячая літаратура толькі яшчэ стваралася. Таленавіты педагог адным з першых зразумеў яе задачы, выступіў супраць спрашчэння зместу дзіцячых кніг.

«Кніга для дзяцей, — гаварыў Янка Маўр, — павінна быць толькі добрай кнігай — цікавай і карыснай». Ён з вялікім майстэрствам спалучаў у сваёй творчасці змястоўнасць з займальнасцю, ніколі не баяўся складаных тэм і праблем, бо ведаў дзяцей, давяраў іх розуму.

У першай аповесці «Чалавек ідзе», якая ў 1926 годзе па частках пачала публікавацца ў часопісе «Беларускі піянер», Янка Маўр зразумела і захапляюча расказаў юным чытачам пра паходжанне чалавека. У цыкле твораў пра іншыя краіны, што былі напісаны таксама ў 20-я гады (аповесці «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», раман «Амок», апавяданні «Слёзы Тубі», «Лацароні» і інш.), ён прапанаваў дзецям незабыўнае падарожжа вакол свету.

Янка Маўр усхваляваў дзіцячыя сэрцы праўдай пра трагічнае становішча працоўных і іх дзяцей пры капіталізме, абудзіў у сэрцах юных чытачоў спачуванне да прыгнечаных, выклікаў нянавісць да эксплуатацыі, да капіталізму наогул. Арганічна ўключаны ў сюжэт твораў пра іншыя краіны вялікі і разнастайны пазнавальны матэрыял аб гісторыі, прыродзе, побыце далёкіх краін.

Любімымі кнігамі юных чытачоў былі і застаюцца вядомыя аповесці Янкі Маўра «ТВТ» і «Палескія рабінзоны», цікавыя сваёй праблемнасцю, паглыбленым псіхалагізмам, сувяззю з надзённымі пытаннямі савецкай рэчаіснасці. У гэтых аповесцях, таксама як і ў іншых творах Янкі Маўра, няма павучанняў «у лоб». Педагагічнага эфекту пісьменнік дасягае ўсім развіццём сюжэту.

Кнігі Янкі Маўра вытрымалі выпрабаванне часам, яны актыўна садзейнічаюць выхаванню «маладой бальшавіцкай змены», да іх па-ранейшаму даверліва цягнуцца сэрцы юных чытачоў, а гэта значыць, што Янка Маўр — наш сучаснік.

М. ЯФІМАВА.

Матэрыялы, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння Я. Маўра, падрыхтавала кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры М. Б. ЯФІМАВА.

Лірычна-Іранічны Факультэт

катэгарычна

віншуе сваіх

прыхільнікаў

з наступаючай

сесіяй!

Непрадбачаныя думкі

* Нарэшце яму далі слова. І ён папрасіў дазволу пакінуць сход.

* Знайшлі агульную мову і... змоўклі.

* Не кліч на дапамогу — могуць падаспець і астатнія ворагі.

* Цяжэй за ўсё зрабіць першы крок, асабліва калі стаіш на краі бездны.

* Рай не для сямейных. Гэта даказалі Адам і Ева.

* Верце ў адноснасць чалавечага шчасця! Так даўжэй пражываце.

Прабачце за выраз

● Культура сасны дала дуба.

● У святле мутных думак.

● Парафраз, а гучыць паўгадзіны.

● Боль на выдумкі хітрая.

● Спачатку было слова дакладчыка, а потым — цяжкае маўчанне.

✦ АРЫГІНАЛЬНУЮ ШПАРГАЛКУ — макавае зерне з запісанымі на ім складанейшымі формуламі — падрыхтаваў да экзамена па арганічнай хіміі студэнт Броня Слаўкін.

Зараз таленавіты самавучка заняты пошукам падыходзячай лупы для незаўважнага чытання гэтых формул.

Па папярэдніх даных, навінка будзе карыстацца павышаным попытам у аднакурснікаў.

✦ НЯЎДАЧА СПАСЦІГЛА на экзамене студэнта трэцяга курса фізічнага факультэта Льва Інтэгралава. Поўнасцю адказаўшы на ўсе пытанні білета, ён не адказаў на дадатковае пытанне экзаменатара:

— Дзе мы з вамі сустракаліся да экзаменаў?

✦ УСЯГО АДНОЙ ночы не хапіла студэнту Гаўрылу Раскачкіну, каб падрыхтавацца да здачы экзамена. Гэта на 12 гадзін лепш за яго мінулагодняе дасягненне.

✦ ЯКОЙ ТОЛЬКІ касметыкай не карыстаецца студэнтка геаграфічнага факультэта Інэса Эльбрусава, а ўсё роўна па яе твары відаць, што сесія ў яе на носе.

✦ УСЮ СВАЮ пераддыпломную практыку студэнт Рыгор Заліваkін правёў у першакласным рэстаране. Ці патрэбна здзіўляцца пасля гэтага, што яму выдадзены дыплом з адзнакай — як лепшаму кулінару.

✦ АМАЛЬ паўгадзіны трымаў экзамен па супраціўленню матэрыялаў студэнт Ізяслаў Стойкі, пакуль выкладчык яму не сказаў:

— Матэрыял вы не ведаеце, супраціўленне дарэмнае.

ВАКОЛ СЕСІІ

СТУДЭНЦКІЯ ПРЫКМЕТЫ

КАЛІ...

...ты выступаеш на семінары і не можаш звязаць двух слоў, значыць табе падсунулі канспект з нейкім неверагодным почыркам.

...выкладчык увайшоў і, агледзеўшы прысутных, здзіўлена глядзіць на цябе, значыць ты зноў трапіў не ў тую аўдыторыю.

...ты спіш і бачыш каляровыя сны, значыць выкладчык паказвае на занятках каляровыя дыяпазітывы.

...студэнтка не мігаючы глядзіць у вочы выкладчыку, а ён саромеецца і чырванее, значыць ён зусім яшчэ малады і працуе нядаўна.

...вы, ідучы міма інтэрната, зайшлі ў госці да сваёй знаёмай і ўбачылі, што на ёй няма твару, значыць яна не паспела нанесці на яго патрэбныя фарбы.

...вы лічыце, што ў вас усё яшчэ наперадзе, а дэкан напамінае, што ў ВНУ вучацца толькі пяць гадоў, значыць да пачатку сесіі застаецца два дні.

...выпускнік гаворыць, што, атрымаўшы дыплом, ён у вадзе не патоне і ў агні не згарыць, значыць пасля заканчэння ВНУ ён хоча ўладкавацца пажарнікам і па сумяшчальніцтву выратавальнікам на пляжы.

З ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ ЗАВОЧНІКА

● Нехта вучыцца дзеля ведаў, нехта — дзеля дыплома, нехта — невядома дзеля чаго. Ну а пакуль мы — студэнты.

● Студэнты — настойлівы народ: даплываюць марафонскую дыстанцыю да канца, толькі ўчора навучыўшыся плаваць.

● Часам з такімі цяжкасцямі атрымліваем мы аўтографы выкладчыкаў у свае залікоўкі, што атрымаць аўтограф вядомага пісьменніка было б, мабыць, значна лягчэй.

● МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

ПЕРАМОЖЦЫ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ аглядуконкурсу мастацкай самадзейнасці студэнтаў універсітэта. Сярод **акадэмічных хораў** першае месца падзялілі калектывы філфака і факультэта радыёфізікі і электронікі, на другім — харавы калектыў мехмата. **Народны хор** механіка-матэматычнага факультэта заняў першае месца, фізічнага — другое, два трэція месцы занялі народныя хоры гістфака і геафака.

Пры падвядзенні вынікаў аглядуконкурсу вызначаны таксама лепшыя **танцавальныя калектывы:** два першыя месцы занялі калектывы мехмата і філфака, два другія — фізічнага і гістарычнага факультэтаў і трэцяе месца ў калектыва факультэта радыёфізікі і электронікі.

Журы назвала лепшых **дэкламатараў** універсітэта: Л. Іваненка (фізфак), Т. Вакар (філфак) — 1-е месца; А. Жаўняровіч (гістфак), Е. Гайдучонак (хімфак) — 2-е месца.

Сярод **фальклорных калектываў** першае месца заняў ансамбль механіка-матэматычнага факультэта, на другім — ансамбль філфака.

Пры падвядзенні вынікаў выступлення **студэнцкіх тэатраў мініяцюр** месцы размеркаваліся такім чынам: тэатр філалагічнага факультэта на першым, СТМ хімічнага і юрыдычнага — на другім месцы, тэатр геафака — на трэцім.

Лепшыя **літаратурныя кампазіцыі** ў філфака, ФПМ (1-е месца), юрфака (2-е месца).

Праслухаўшы паведамленне аб выступленні вакальных груп, дуэтаў і трыо, журы пастанавіла лічыць лепшымі **вакальныя групы:** фізфака — 1-е месца, мехмата — 2-е месца; **дуэты:** факультэта радыёфізікі і электронікі, хімфака — 1-е месца, фізфака і гістфака — 2-е месца, біяфака — 3-е месца; **трыо:** філфака (жан.)—1-е месца, філфака (муж.)—1-е месца, юрфака — 2-е месца, ФПМ—3-е месца.

Лепшымі **салістамі-вакалістамі** прызнаны: М. Кізюкоў (ММФ), В. Васіленка (філфак), Г. Рузаў (хімфак) — 1-е месца; Л. Пухоўская (фізфак), Л. Ярошанкаў (біяфак) — 2-е месца.

Прызавыя месцы сярод **салістаў-інструменталістаў** занялі: Т. Цыбульская — фартэпіяна (мехмат), Л. Няхамкін — флейта (мехмат)— 1-е месца; Я. Дэц — фартэпіяна (філфак), В. Крывашэеў — фартэпіяна (біяфак), Я. Волк — цымбалы (мехмат) — 2-е месца.

Першае месца заняў таксама **дуэт скрыпачоў** фізічнага факультэта.

Журы агляду-конкурсу вызначыла лепшых **самадзейных паэтаў** і **кампазітараў.**

Самадзейныя паэты: А. Канапелька, Т. Каваленка, І. Сабачэўская (усе філфак) — 1-е месца; **самадзейныя кампазітары:** Г. Дзмітрук (факультэт радыёфізікі і электронікі) — 1-е месца, Ю. Кручонак (ФПМ) — 2-е месца, А. Страшко (фізфак) — 3-е месца.

Па агульнай колькасці балаў месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам: філфак, мехмат (падзялілі 1 — 2 месцы), фізфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, гістфак, юрфак, хімфак, геафак, ФПМ, біяфак, журфак.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

УСЁ—НАПЕРАДЗЕ!

Хачу расказаць чытачу аб нашым будатрадзе «Асоль», аб нашых поспехах і праблемах.

Цяжка сказаць, што лягчэй — падрыхтоўчы перыяд ці рабочы. Раней я не ведала, што, перш чым выехаць на месца дыслакацыі, трэба шмат папрацаваць: афармленне дакументацыі, медагляд, выпуск насценгазет, суботнікі і выступленні агітбрыгады...

Невядомая справа заўсёды прыцягвае да сябе навізной. Вось так і нас захапіла будатрадаўскае жыццё. Упершыню мы ўдзельнічалі ў конкурсе агітбрыгад. Хоць вынікі і не надта высокія, але галоўнае, як дзяўчаты рыхтаваліся да гэтага конкурсу. Яны самі распрацавалі сцэнарый, амаль кожны дзень заставаліся на рэпетыцыі.

Добра наладжана ў нас работа рэдкалегіі і лектарскай групы. За падрыхтоўчы перыяд мы выпусцілі 4 нумары газет, афармілі куток па тэхніцы бяспекі і куток ганаровага байца.

Але яшчэ рана гаварыць аб будучых поспехах атрада. Наперадзе самы адказны час— праца на цагельным заводзе. Але ўжо сёння ёсць пэўныя дасягненні: у сакавіку наш атрад заняў другое месца ў сацыялістычным спаборніцтве будатрадаў юрыдычнага факультэта.

Ёсць у нас на факультэце атрады, на якія мы глядзім з зайздрасцю. Гэта, напрыклад, «Славія». Усе байцы добра ведаюць будатрадаўскае жыццё, таму і справы ў іх ідуць намнога лепш, чым у іншых. Каб хоць дзесяць такіх вопытных байцоў у наш атрад, тады б адразу адпалі многія праблемы. Але і цяпер мы без бою не здадзімся. У нас усё — наперадзе!

З. САУЛІЧ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

26 мая 1983 г.

Зак. 979. АТ 04255.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ